**Гэты цуд завецца песня.**
**Паседжанне паэтычна-музычнай гасцёўні “Натхненне”.**



Народная песня — наша духоўная гісторыя, наша святыня, наш корань. З вуснаў у вусны, ад сэрца да сэрца, праз многія сотні гадоў прыйшоў ў сённяшні дзень гэты цуд.... Любіце добрую песню, добрую музыку, яна сапраўдны сябар. Яна робіць чалавека дабрадушней, чысцей, справядлівей...

Міхаіл Дрынеўскі

Народная песня – як малітва. Яна ўзвышае чалавека і з’яўляецца аб’яднаннем паэзіі і музыкі. Слухаць такія творы заўсёды прыемна.

Наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання грамадзян сталага ўзросту цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна мелі магчымасць у чарговы раз сустрэцца з выканаўцамі народнай песні, якія гучалі ў выкананні народнага сямейнага ансамбля “Граўжанцы” аддзела культуры і вольнага часу аграгарадка Граўжышкі. Гэта вельмі творчыя людзі, якія заўсёды, дзе б яны ні выступалі, дараць прыгожую музыку і прыгожую родную беларускую песню сваім слухачам.





Менавіта гэты калектыў па-сапраўднаму любіць добрую песню, добрую музыку, і яна для іх надзейны сябар, бо песня аб’ядноўвае ўдзельнікаў калектыву ў адзінае цэлае і робіць іх дабрадушней, чысцей і справядлівей.

Вядучая мерапрыемства пазнаёміла прысутных з гісторыяй стварэння калектыву, іх творчасцю і дасягненнямі.

Сваё выступленне нашы госці пачалі з выканання песні “Святочная”, а далей, як кажуць, што з рога ўсяго многа, так і ў выкананні артыстаў пасыпаліся прыгожыя, душэўныя, меладычныя песні: “Ехаў Ясь на кані”, “Колькі ў небе зор”, “Да цешчы на бліны”, “А над рэчкай туман” і інш.



Парадаваў слухачоў Эдуард Булкевіч, у выкананні якога прагучала байка “Не дабраўся”.

Прыемным момантам сустрэчы стала сумеснае выкананне танца "Кракавяк". Удзельнікі мерапрыемства з вялікім задавальненнем танцавалі разам з артыстамі.

Свявалі "Граўжанцы", лілася песня і кранала патаемныя струны душы, несла ўдалячынь, у маладосць, пад тую бярозку, дзе гучалі першыя прызнанні ў каханні, на той мосцік і рэчку, які вабіў да сябе хлапцоў і



дзяўчат на першае спатканне, пра туман, які сваім шэрым пакрывалам акутваў ад чужога вока першы пацалунак закаханых… Спявалі "Граўжанцы"... І людзі, слухаючы гэтыя песні, сядзелі, як завароржаныя. Цудоўныя галасы выканаўцаў глыбока западалі ў душу! У зале стаяла такая цішыня, што, здавалася, усе ў царкве апынуліся. Удзячныя слухачы доўга-доўга не адпускалі артыстаў са сцэны.



Рыгор Шырма пісаў: «Кожны народ мае свой асаблівы духоўны характар, які знаходзіць найбольшае адбіццё ў яго песнях... У песнях чуваць, аб чым народ сумуе і да чаго рвецца яго думка... Песня народа - гэта сапраўдная чалавечая душа». У гэтым мы пераканаліся, пазнаёміўшыся з такім цудоўным калектывам.

Тэрэса Кошань
спецыяліст па сацыяльнай рабоце
ТЦСАН Ашмянскага раёна